Дзяржаўная ўстанова культуры
“Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна”
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## ДЗМІТРЫЕЎ Барыс Міхайлавіч

# ДЗМІТРЫЕЎ
# Барыс Міхайлавіч

**(11.06.1924 – 23.02.1944)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Дзмітрыеў Барыс Міхайлавіч - камандзір дыверсійнай групы 211- га партызанскагаатрада імя К.К. Ракасоўскага на часова акупаванай тэрыторыі Магілёўскай вобласці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.**

**Нарадзіўся 11 чэрвеня 1924 года ў Масквеў сям'і служачага. Адукацыя сярэдняя.У 1942 годзе скончыў спецыяльную школу падрыўнікоў - мінёраў, пасля чаго ў ліпені 1942 года накіраваны ў партызанскую групу Р. Н. Баразны (са студзеня 1943 - 211-ы партызанскі атрад імя К.К. Ракасоўскага), якая дзейнічала ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці.**

**Камсамолец Барыс Дзмітрыеў быў камандзірам дыверсійнай групы. Ён асабіста ўдзельнічаў у падрыве васемнаццаці варожых эшалонаў, у выніку чаго было знішчана 1260 гітлераўцаў, восем танкаў,**

трыццаць дзве аўтамашыны, адзінаццаць гармат, 154 тоны гаручага.

Барыс Дзмітрыеў падрыхтаваў чатырнаццаць партызан-падрыўнікоў. Дыверсійныя групы, якія ён узначальваў, ўзарвалі больш за тысячу чатырыста чыгуначных рэек, адзінаццаць чыгуначных і 32 шашэйных моста, дваццаць дзве аўтамашыны і тры танкі праціўніка.

Летам 1943 года ўаперацыі па знішчэнні варожага гарнізона ў Асіповіцкім раёне Б.М. Дзмітрыеў быў узнагароджаны медалём“Партызану Айчыннай вайны” I ступені.

Узнагароджаны таксама ордэнам Леніна.

Адважны 19-гадовы партызан-падрыўнік Б.М. Дзмітрыеў загінуў смерцю храбрых у баі 23 лютым 1944 года ў вёсцы Каменічы Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Пахаваны ў горадзе Асіповічы Магілёўскай вобласці.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка - фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства Дзмітрыеву Барысу Міхайлавічу пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Імем Героя названы вуліца і школа № 1 у горадзе Асіповічы.




***Мемарыяльны пакой імя Б.М.Дзмітрыева ў школе №1***

***г. Асіповічы***

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**23 лютага 1944 года, у дзень святкавання чарговай гадавіны Чырвонай арміі, буйная часць эсэсаўскіх войскаў напала на партызанскую заставу, размешчаную ў в. Каменічы. Невялікая група партызан, якая ахоўвала вёску, заўважыўшы варожы ланцуг, паслала за дапамогай у штаб злучэння, а сама адбівала атакі, несучы вялікія страты. Калі ў баі загінуў палітрук Трубіцын, падрыўнік Барыс Дзмітрыеў узначаліў абарону.**

**Неабходна было адыходзіць у лес. Мясцовасць адкрытая. Масіраваны агонь ворага не даваў падняць галавы. Кароткімі перабежкамі, паўзком партызаны прасоўваліся да лесу, адстрэльваючыся ад эсэсаўцаў. Адзін за адным падалі пад кулямі ворага баявыя таварышы. Вось ён побач, вырататавальны лес. Засталося некалькі метраў. Апошні рывок, а там родныя бярозы ды сосны ўкрыюць ад варожых куль. Разам падкасіліся ногі, і да сэрца дайшла нясцерпная боль. Барыс ўпаў на снег. Абедзве нагі прастрэлены. А фашысты вось-вось наваляцца. Ужо бачны іх звярыныя, зларадныя твары. Барыс зноў аўтаматнымі чэргамі спыніў іх. Упаў адзін, другі гітлеравец. Эсэсаўцы заляглі. Чакаюць. Становішча крытычнае. Зноў бягуць фашысты, нібы сцярвятнікі на сваю здабычу. Адзін, другі стрэл. Аўтамат змоўк.**

Скончыліся патроны. Гэта заўважылі фашысты. Яны ўсталі ва ўвесь рост, ідуць смела, пераможна. Папаўся, партызан! Акружылі Барыса, стаяць над ім бездапаможным. І нечакана раздаўся выбух. Гэта Барыс падарваў пад сабой гранату.

З ушанаваннямі пахавалі таварышы юнага масквіча на беларускай зямлі. У пасляваенныя гады адбылося перапахаванне, і цяпер ён пахаваны ў брацкай магіле ў Асіповічах.



# ЛІТАРАТУРА


1. Дмитриев Борис Михайлович – Герой Советского Союза, похоронен в г.Осиповичи// Их именами названы… -- Мн., 1987. -- С.189.
2. Дмитриев Б.М. // Навечно в сердце народном. -- Мн., 1984. -- С.148--149.
3. Дмитриев Б.М. // Герои Советского Союза: краткий биограф.словарь. В 2т. Т.1. -- Мн., 1987. -- С.429.
4. Дмитриев Борис Михайлович [Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа : http://www.warheroes.ru